# КОЛА ПРАФЕСІЙНАГА БАЛАНСА
# (аб 10 - бальным ацэньванні на вучэбных занятках
# па замежнай мове)

Хадасевіч Галіна Сільвестраўна,
метадыст упраўлення вучэбна-метадычнай работы АПА

**17 снежня 2020 года — пасяджэнне рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў замежных моў**.

Здольныя да творчасці, крапатлівыя, добразычлівыя, якія разумеюць адзін аднаго – амаль усе яны захацелі прыехаць у акадэмію паслядыпломнай адукацыі і засведчыць свае ідэі і прапановы ў рамках заяўленай тэмы.

Настаўнікі англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” Булай Іна Баляславаўна і Капуста Кацярына Пятроўна, якія працуюць у сярэдняй школе № 8 г.Ліды, а таксама настаўніца нямецкай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” Гарошка Таццяна Мікалаеўна Мар’інагорскай гімназіі ўдакладнілі практычныя аспекты рэцэптыўных відаў моўнай дзейнасці.

Уладзімір Міхайлавіч Паркалаў, настаўнік нямецкай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” сярэдняй школы № 1 г.Асіповічы абмеркаваў уменні вучняў для поўнага асэнсавання зместу тэкста і ўспрымання рэчы на слух з дапамогай матэрыялаў “Лексіка-граматычны практыкум” для 8 класа.

Растлумачыла выкарыстанне сучасных айчынных вучэбных дапаможнікаў па англійскай мове пры ацэньванні іншамоўнай маўленчай вуснай і пісьмовай дзейнасці Арлова Вераніка Федараўна, настаўніца англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” сярэдняй школы № 14 г.Мазыра.

Гутарылі прысутныя пра асаблівасці ацэньвання іншамоўнай дыялагічнай дзейнасці сваіх навучэнцаў. Настаўнік англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” Сарока Аляксандр Мар’янавіч з ліцэя Івацэвіцкага раена Брэсцкай вобласці. Інтэрактыўныя заняткі з членамі творчай групы правяла Ліпай Алена Валер’еўна, настаўніца англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” сярэдняй школы № 46 г. Магілева (*https://wordwall.net/ru/resource/8692714*).

Падзялілася магчымасцю “10-бальная сістэма крытэрыяў расійскіх аўтараў па ацэньванню маналога на замежнай мове” Бераснева Аксана Міхайлаўна, настаўніца англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” гімназіі № 24 г.Мінска, паколькі распрацоўнікі 10-бальнай сістэмы ацэньвання па замежнай мове адштурхоўваліся ад Еўрапейскіх стандартаў.

Вольга Вячаславаўна Негурэ, настаўніца нямецкай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” гімназіі № 24 г.Мінска, якая ўваходзіць у склад аўтараў падручнікаў па нямецкай мове з павышаным узроўнем, зрабіла ўвагу настаўнікам, што і якім чынам можна засвоіць вучэбны матэрыял для вучняў. Напрыклад, выразіць меркаванне, абгрунтаваць штосьці, выказаць сваю думку і г.д. Трэба навучыць вучня, адпрацаваць камунікатыўныя навыкі на ўроку, а затым ужо праводзіць ацэньванне згодна 10-бальнай сістэме. Аўтарка прывяла прыклады з падручнікаў па нямецкай мове.

Напрыканцы пасяджэння ўдзельнікаў рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў замежных моў Касталомава Юлія Уладзіміраўна, настаўніца іспанскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” гімназіі № 2 г.Ваўкавыска і Лобач Ала Афанасьеўна, настаўніца французскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” гімназіі № 2 г.Ваўкавыска, адзначылі галоўнае — кола прафесійнага баланса, паміж творчасцю і здароўезберажэннем. Калі ва ўсім будзе баланс, то можна працягваць самыя смелыя ідэі ў педагагічнай дзейнасці, што дае магчымасць вучыць і вучыцца разам са сваімі выхаванцамі на ўроках замежнай мовы.

